Вікторыя Сінічкіна

Газета «Раніца» № 18, 4 мая 2006

# СВЯТА ЎЛАДАРА ЗАЛАТЫХ КЛЮЧОЎ

Надвячоркам 24 красавіка наведвальнікі дзіцячага цэнтральнага сталічнага парка імя М.Горкага міжволі сталі ўдзельнікамі народнага абрадавага свята. Нашы продкі прымяркоўвалі яго да дня, калі свойскую жывёлу першы раз пасля зімы выганялі пасвіцца ў поле і ладзілі ўшаноўванне Святога Юрыя – ахоўніка жывёлы і першых парасткаў збожжа.



Пра тое, чаму вясковае свята з'явілася ў гарадскім парку, «Раніцы» расказала яго арганізатар, загадчык аддзела народных рамёстваў і фальклору Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, кіраўнік фальклорнага гурту «Верас» Таццяна Пладунова:

— *Наша мэта — адраджаць нацыянальныя традыцыі беларусаў, і перш за ўсё абрадамі, якіх так багата ў айчыннай культуры. Сённяшняе свята прысвечана бажаству Юр'я, якое лічылася апекуном статку і спрыяла ўрадлівасці. Юр'я называлі ўладаром залатых ключоў — прамянёў сонца, якія ажыўляюць усё навокал. Мы зрабілі невялічкі Юр'еўскі фэст у Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі з мэтай падзяліцца адно з адным радаснай веснавой энергіяй.*

На міні-фестываль сабраліся фальклорныя гурты «Ветах», «Верас» і «Гронка» НЦМТДіМ, ансамблі «Вяснянка» з вёскі Чурылавічы і «Куманёк» з вёскі Міханавічы Мінскага раёна, гурт музвучылішча імя М. Глінкі «ЭтнаНХС», «Талака» з універсітэта культуры і мастацтваў.



РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ